РЭЧЫ І ГІСТОРЫІ

ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

"ЗЕЛЕНЯ"

РУКАПІСНЫ ЗБОРНІК ПЕРАКЛАДАЎ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА


Максимъ Богдановичъ

Зеленя

стихи

переводъ съ белорусскаго автора

Переводы стиховъ – словно женщины:
если красивы, то не верны; если верны,
то не красивы.

Нѣмъ писат. поговорка.

Ярославль

1909 – 1913

Адзін з самых каштоўных экспанатаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча – рукапісны зборнік аўтаперакладаў паэта "Зеленя". Лёс архіва творцы пасля Вялікай Айчыннай вайны застаецца нявысветленым. Таму кожны аўтограф М. Багдановіча, а тым больш сшытак твораў, – сапраўдны скарб. Лінаваныя лісты, складзеныя ў невялікую 13,1 х 20,8 *см* кніжачку на 32 старонкі, утрымліваюць 22 вершы Максіма Адамавіча, напісаныя чорным чарнілам. На першай старонцы ўказаны аўтар – *Максім Багдановіч*. Чыясь рука не вельмі ахайна падкрэсліла імя дзвюма сінімі рыскамі. Ніжэй змяшчаецца назва "*Зеленя*" і падзагаловак: "*Стихи. Перевод с белорусского автора*". Яшчэ ніжэй справа цытуецца выказванне – перыфраз з М. Г. Сафіра: "*Переводы стихов – словно женщины: если красивы, то не верны; если верны, то не красивы*". А ўнізе пазначаны месца і час напісання вершаў: "*Ярославль. 1909–1913 гг.*".

Падораны зборнік чалавеку невыпадковаму. На адвароце тытульнай старонкі стаіць кароткае пяшчотнае: "*Нюте*". Ганна Гапановіч – стрыечная сястра Максіма, іх звязвалі самыя цёплыя пачуцці. Яны падтрымлівалі стасункі з ранняга дзяцінства, шмат часу праводзілі разам і ў Мінску, пакуль Адам Багдановіч уладкоўваўся на новым месцы, і ў Ніжнім Ноўгарадзе, куды Гапановічы таксама неўзабаве пераехалі. У любой кампаніі Ганна была сапраўднай зоркай, вакол якой гуртаваліся родныя і сябры. Разумная і абаяльная дзяўчына шчыра цікавілася літаратурнымі заняткамі стрыечнага брата, дзялілася яго вершамі з таварышкамі.

"Зеленя" змяшчае вершы з цыклаў "Старая спадчына", "Полынь-трава", "Старая Беларусь", "У зачарованым царстве", "Думы" і "Вольныя думы" – перад намі сапраўднае аўтарскае выбранае. "Вянок" з аўтографам "*сестрице Нюте*" Ганна атрымала неўзабаве пасля выхаду кнігі, але, згодна з успамінамі бацькі паэта, не магла ацаніць вершаў на беларускай мове, бо дрэнна ёю валодала. Мы дакладна не ведаем, ці пераклады са зборнічка "Зеленя" былі створаны спецыяльна для Ганны, але менавіта жаданне зрабіць прыемнае кузіне паспрыяла яго з'яўленню.

Пэўны час М. Багдановіч нават планаваў перабрацца бліжэй да сям'і Гапановічаў. Пра гэта сведчыць ліст Пятра Гапановіча да сястры Веры ад 6 мая 1915 г.: "*Если уж ставить точку над і, то все сводилось к тому, что ни там, ни здесь не оказалось людей, на которых можно было бы разсчитывать, что они по-христиански возьмут на себя заботы о нем, будут достаточно примерны, чтобы являть собой образец достойный подражания, и в то же время были бы ценны, как человеки, чтобы в обществе их могло шириться и крепнуть, стимулируемое извне, устремление в новую жизнь.*

Теперь, сестрица, если ты осведомлена, чьей нежной рукой ранено безнадежно сердце нашего cousin'a М., то конечно догадалась, что в конце концов (несколько дней тому назад) мне был предложен прямой вопрос, как я смотрю на возможность обосноваться у нас в семье. Я ждал этого вопроса со дня на день и поэтому вполне подготовленный, весьма мягко и дипломатично объяснил всю химеричность и заведомую неосуществимость такого проекта". Праект сапраўды не спраўдзіўся.

Зборнік "Зеленя" захоўваўся ў Нюты да 1941 г., пакуль яе не стала і кніга не патрапіла да яе сястры Веры, а далей да стрыечнай пляменніцы М. Багдановіча Настассі Глебаўны Кунцэвіч і праз яе да знакамітага бібліёграфа Ніны Ватацы, якая перадала каштоўны рукапіс у музей.

Варта адзначыць, што большасць вершаў Максіма Багдановіча на рускай мове – гэта аўтапераклад, а першай мовай паэзіі яго была якраз-такі беларуская. Менавіта на ёй у геніяльнага творцы атрымлівалася як найлепш перадаць свае думкі і пачуцці.

Міхась БАРАНОЎСКІ,
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.